Пятро Жаўняровіч
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

НОВАЕ Ў ПУБЛІЦЫСТЫЧНАЙ СПАДЧЫНЕ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

Да 80-годдзя пісьменніка

У беларускай літаратуры няма, бадай, іншага пісьменніка, які так плённа працаваў у разнастайных жанрах публіцыстыкі. Пачынаючы сваю творчую дзейнасць у 1955 г. эсэ-нарысам «Вязынка» і баладай «Машэка», У. Караткевіч не перарываў публіцыстычнай дзейнасці да апошняга года жыцця. Мяркуем, што гэта было прадыктавана імкненнем пісьменніка знаходзіцца ў рэчышчы сацыяльных працэсаў і актыўна ўплываць на грамадскую свядомасць, з дапамогай немастацкіх твораў будзіць у грамадзяніна сваёй краіны гістарычную памяць, развіваць пачуццё патрыятызму і чалавекалюбства. Прычым публіцыстычныя творы не сталі аднадзёнкамі, не ўстарэлі з часам, а набылі яшчэ большую актуальнасць.

Змешчаная ў 1990–1991 гг. у дзвюх кнігах 8-га тома Збору твораў і ў асобным томе «Творы» (1996 г.) публіцыстыка У. Караткевіча – толькі частка грамадска-палітычнай літаратурнай спадчыны пісьменніка (48 тэкстаў). Але шмат якія апублікаваныя раней беларускамоўныя творы былі невядомыя або не былі запланаваныя да ўключэння ў названыя выданні (як і рускамоўная публіцыстыка). Акрамя таго, асабісты архіў пісьменніка знаходзіўся ў кватэры У. Караткевіча і да перадачы ў дакументасховішча не быў упарадкаваны, таму неапублікаваная спадчына У. Караткевіча не стала даступнай чытачам.

Намі выяўлены прынамсі 47 твораў, якія з пункту гледжання эдыцыйнай практыкі неабходна было б змясціць у галоўным корпусе новага збору твораў У. Караткевіча, а менавіта:

1. Творы, апублікаваныя пры жыцці пісьменніка, але не ўключаныя ў Збор твораў 1987–1991 гг.

1.1. На беларускай мове (19), сярод іх:

– *«Тысячу стагоддзяў табе»* (Маладосць, 1974, № 8) – эсэ-нарыс, прысвечаны 1000-годдзю Віцебска;

– «*З шалёнай вышыні (песня аб далечах)*» (Чырвоная змена, 1971, 16 лют.) – эсэ-нарыс пра Рагачоў;

– «*Абраная*» (літаратурны зборнік «Братэрства, 1982») – эсэ-нарыс пра Украіну;

– «*Цёплы жнівеньскі поўдзень*» (Полымя, 1969, № 11) – эсэ-партрэт да 60-годдзя Максіма Лужаніна;

– «*Людзям простым для добрага навучэння*» (Ніва, 1967, 6 жн.) – эсэ-партрэт пра Францыска Скарыну;

– «*Слова пра Шолахава*» (Маладосць, 1975, № 5) да 70-годдзя рускага празаіка;

– «*Калі на зямлі ёсць казачныя краіны...*» («Краявіды Беларусі», 1968) – эсэ-замалёўка – прадмова да фотаальбома і інш.

Заслугоўваюць увагі і інтэрв'ю пісьменніка «*Каласы з цаліны*» (ЛіМ, 1967, 21 ліп.), «*Любую справу рабіць хвацка*» (ЛіМ, 1982, 3 сн.), «*Найперш – судзіць чытачу*» (ЛіМ, 1983, 18 лют.) і «*Паслужу да канца*» (Голас Радзімы, 1980, 10 студз.).

1.2. На рускай мове (13), сярод іх:

– «*Экзамен в Падуе*» (Неман, 1967, № 8);

– «*Читателям "Чозении"*» (Молодая гвардия, 1970, № 9);

– «*Жажда*» (Дружба народов, 1973, № 9);

– «*Он один такой – Янка Купала*» (Новый мир, 1982, № 10);

– «*Что случилось с рассказом?*» (Литературная газета, 1972, 11 окт.).

Выклікаюць цікавасць два матэрыялы (нарысы), апублікаваныя ў час праходжання У. Караткевічам вайсковых збораў на Ціхаакіянскім флоце – «*Рождения сорок второго*» і «*Счастливого плавания, старшина!*» (Боевая вахта, 1965, 29 авг.; 16 сент.), а таксама інтэрв'ю «*Культурный человек: какой он?*» (Знамя юности, 1976, 12 марта), «*Город моей любви*» (Гродненская правда, 1977, 24 марта), «*Люблю свою Белую Русь*» (Сельская газета, 1980, 4 дек.), «*Каждая книга – часть жизни*» (Интеграл, 1982, 15 апр.).

2. Неапублікаваныя творы. Яны выяўленыя ў асабістым архіве пісьменніка, у 2010 г. упарадкаваным у аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (фонд 11).

2.1. На беларускай мове (8):

– «*Я люблю цябе*» – эсэ пра Беларусь, сапраўдны гімн роднай зямлі;

– «*Браслаўе*» – эсэ-нарыс, прысвечаны «краю блакітных азёр»;

– «*Сон аб тым, што было*» – прызначаны ўкраінскаму чытачу новы твор пра Кіеў (зусім не паўтарае «Мой се градок!», змешчаны ў Зборы твораў);

– «*Вільнюс – частка душы маёй*» (у Зборы твораў ёсць эсэ «Вільнюс – часцінка майго сэрца», але гэта пераклад з апублікаванага на літоўскай мове тэксту);

– «*Доўгі адказ на тры кароткія пытанні*» і «*Адказы на пытанні, звязаныя з тэмай: "Нацыянальнае і інтэрнацыянальнае ў духоўнай культуры асобнага народа – як часткі чалавецтва"*» вельмі важныя для разумення поглядаў У. Караткевіча на свет і чалавека ў ім;

– «*Асабістая зацікаўленасць (рэпліка)*» – развагі пра кнігу Генадзя Кісялёва «Сейбіты вечнага»);

– «*Рэцэнзія – яна ж невялікі ўступ*» – крытычны погляд літаратара на кнігу вершаў Адама Глобуса «10 на 10».

2.2. На рускай мове (7):

– «*Святая Предслава*» – захапляльнае слова пра Ефрасінню Полацкую;

– «*Дружба навеки*» – артыкул пра гістарычныя і чалавечыя сувязі беларускага і літоўскага народаў;

– «*Господину Председателю II специальной сессии Генеральной Ассамблеи ООН по разоружению…*» – зварот, прасякнуты антываеннай накіраванасцю;

– «*Джон – ячменное зерно*» – спроба пісьменніцкага асэнсавання такой антысацыяльнай з'явы, як п'янства (падпісаны крыптанімам Н Н.);

– «*Их опыт должен быть закреплен*» – артыкул пра ваенных маракоў;

– «*Мысли по поводу романа В. Дудинцева "Не хлебом единым"*» – адзін з ранніх крытычных артыкулаў У. Караткевіча;

– «*К вопросу о лопухах*» – рэпліка пра адказнасць крытыкаў і літаратурных рэдактараў.

Большасць твораў другой групы былі прапанаваныя перыядычным выданням, але па розных прычынах, у тым ліку і па цэнзурных, не пабачылі свет пры жыцці пісьменніка. Напрыклад, перад машынапісам твора «Святая Предслава» на асобным аркушы пазначана адным з супрацоўнікаў «Немана»: «Александр Сергеевич! Володя Короткевич просил возвратить ему Ефросинью Полоцкую (текст и снимки). 13 июня

1973 г.». Пісьменнік, відаць, разумеючы, што без правак такі твор не абыдзецца, вырашыў пакінуць яго да лепшых часоў.

Хочацца верыць, што гэтыя часы ўжо насталі, і ўсёй спадчыне Вялікага Беларуса, апублікаванай і невядомай дагэтуль, знойдзецца месца ў поўным зборы твораў У. Караткевіча, бо асэнсаванне кожнага новага твора, кожнага яго варыянта, кожнага неабгрунтавана скарочанага фрагмента ўзбагачае духоўны скарб нацыі і папаўняе яе інтэлектуальны патэнцыял, дапамагае грамадзяніну ва ўсведамленні сябе годным прадстаўніком еўрапейскага народа.